# ВЫСТАЎКА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ ІМЕНІ ЛЕНІНА

У Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імені Леніна адкрываецца вялікая літаратурная выстаўка, прысвечаная XX гадавіне вызвалення БССР ад белапалякаў. Раздзелы выстаўкі афармляюцца на тэмы: «Ленін і Сталін — арганізатары БССР», «Беларусь у мінулым і ў сучасным», «Вызваленне заходніх абласцей БССР», «Дасягненні БССР за 20 год», «Міжнароднае становішча і задачы абароны».

На выстаўцы будзе прадстаўлена каля 200 кніг, гістарычныя дакументы і фотаздымкі.

З 6 па 15 ліпеня работнікамі бібліятэкі будуць праводзіцца на прадпрыемствах горада чыткі мастацкай літаратуры, прысвечанай гадавіне.

(БЕЛТА).